З Савета рэктараў

## ПРЫ ПАШЫРАНЫХ ПАЎНАМОЦТВАХ

З 24 красавіка па 1 мая бягучага года на базе Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны будзе праходзіць II Міжнародны фестываль "Артсесія". Чакаецца, што акрамя арганізатараў у ім прымуць удзел дэлегацыі Расіі і Украіны, Францыі, Італіі, Шатландыі, Індыі, Венгрыі, Чэхіі, Польшчы, Нарвегіі.

Падрыхтоўцы да шырокамаштабнага культурнага мерапрыемства цяпер надаецца вялікая ўвага. І заканамерна, што гэта пытанне стала прадметам абмеркавання на чарговым пасяджэнні Савета рэктараў Гомельшчыны. Яго старшыня -- рэктар ГДУ акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў у сваім выступленні гаварыў аб важнасці фестывалю ў збліжэнні студэнцкай моладзі розных краін, а таму яго неабходна правесці на высокім узроўні. У кожнай ВНУ вобласці трэба загадзя паклапаціцца аб гасцінным прыёме замежных дэлегацый, належным чынам падрыхтаваць канцэртныя пляцоўкі.

Другім па парадку дня было абмеркавана пытанне аб парадку адкрыцця новых спецыяльнасцей і спецыялізацый у вышэйшай школе рэгіёна. Гэта было выклікана тым, што Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь за апошні час надае значна большае значэнне рабоце Саветаў рэктараў, пашырае іх паўнамоцтвы ў вырашэнні многіх праблем жыццядзейнасці ВНУ. У дадзеным выпадку па даручэнню Міністэрства разгледжана хадайніцтва Гомельскага політэхнічнага інстытута аб адкрыцці ў ім новых эканамічных спецыяльнасцей.

У рабоце Савета рэктараў прыняў удзел і выступіў першы намеснік міністра адукацыі і навукі прафесар В.П.Стаўроў. Ён гаварыў аб тым, у якіх складаных умовах знаходзяцца цяпер усе калектывы галіны, шляхах выхаду з крызіснага становішча, аб стварэнні нарматыўна-прававой базы, якая павінна забяспечвацца прыняццем Вярхоўным Саветам нашай краіны новых нарматыўных актаў і законаў па развіццю адукацыі і навукі.

**Б.ВАЛОДЗІН.**


ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 6 (907) | Серада, 10 красавіка 1996г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная


## ПЕРШЫ ВЫПУСК ЮРЫСТАЎ

5 гадоў мінула з таго часу, як у нашым універсітэце адкрылася новая спецыяльнасць -- "Правазнаўства". Гэта было выклікана вострай патрэбай кадраў па юрыспрудэнцыі на Гомельшчыне. І вось нядаўна адбылася знамянальная падзея: 40 "навяспечаных" юрыстаў атрымалі накіраванні на працу. На іх размеркаванні прысутнічалі кіруючыя работнікі, прадстаўнікі упраўленняў унутраных спраў, юстыцыі аблвыканкома, пракуратуры вобласці.

Пасля абароны дыпломных работ і здачы дзяржаўных экзаменаў маладыя спецыялісты запоўняць вакантныя месцы ў праваахоўных органах горада і вобласці, будуць прымяняць атрыманыя веды на пасадах следчых, памочнікаў пракурораў, суддзяў, адвакатаў, натарыусаў, юрысконсультаў.

Каб вучыць і выхоўваць новыя кадры юрыстаў, дзвюм маладым кафедрам гісторыка-юрыдычнага факультэта -- правазнаўства, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права -- таксама трэба папаўняцца і ўдасканальвацца. Таму з ліку першых выпускнікоў пакінуты на працу ва універсітэце выдатніца вучобы Ала Усціновіч і Уладзімір Данчанка. У кіраўніцтва універсітэта ёсць спадзяванні і на тое, што цяперашнія выпускнікі-юрысты пасля працы ў праваахоўных органах, набраўшыся дастатковага практычнага вопыту, таксама змогуць аказаць выпускаючым кафедрам істотную дапамогу ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў.

**Т.ДУБЯК.**

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У апошні чацвер мінулага месяца адбылося чарговае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне Савета універсітэта. Па інфармацыі начальніка аддзела па рабоце ў інтэрнатах В.П.Гапеева абмеркавана пытанне аб стане выхаваўчай работы ў студэнцкіх інтэрнатах і мерах па яе паляпшэнню. На гэта накіравана прынятае рашэнне.

Па інфармацыі дэкана геолага-геаграфічнага факультэта прафесара А.П.Пінчука прынята рашэнне аб структурнай рэарганізацыі названага факультэта.

Савет заслухаў навуковы даклад на медыцынскую тэму доктара медыцынскіх навук прафесара А.С.Калугіна.

Па конкурсу на вакантныя пасады дацэнтамі абраны: У.В.Арлоў -- па кафедры ВМ і праграміравання, В.П.Горленка -- па кафедры педагогікі.

Савет рэкамендаваў Атэстацыйнай калегіі Мінадукацыі і навукі РБ аб прысваенні вучонага звання дацэнт кандыдатам навук Л.А. Селькінай з кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю, А.Ф. Карпенку -- з кафедры фізіялогіі чалавека і жывелін, В.А.Капытку -- з кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.

## ВЯРНУЛІСЯ З ФРАНЦЫІ

На працягу амаль дзвюх дэкад у сакавіку група студэнтаў эканамічнага і гісторыка-юрыдычнага факультэтаў нашага універсітэта, якія паралельна праходзяць падрыхтоўку ў Франка-беларускім інстытуце кіравання пры ГДУ, разам з садырэктарам гэтага інстытута, дэканам факультэта прафарыентацыі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ А.У.Гаўрылюком, дэканам эканамічнага факультэта Т.В.Карпей і вядучымі выкладчыкамі сумеснай вышэйшай навучальнай установы выязджалі ў Францыю. У адпаведнасці з праграмай напачатку адбылася незабыўная экскурсія па вечна маладому і вельмі багатаму на гістарычныя помнікі Парыжу.

Затым жаданых гасцей з Гомеля чакаў горад-пабрацім Клермон-Феран, дзе ў інстытуце "Інжынерыя менеджмента" мясцовага універсітэта яны прайшлі стажыроўку.

Больш падрабязна пра гэтую падзею мы раскажам у адным з бліжэйшых нумароў нашай газеты.

### *ВІНШУЕМ!*

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты гісторыка-юрыдычнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры гісторыі Беларусі ПІЧУКОВА Віктара Пятровіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.*

# ЕДУЦЬ З АДКРЫТЫМ СЭРЦАМ

Цяпер ужо нікога не здзіўляе тое, што ў Гомелі вельмі частымі гасцямі сталі дэлегацыі з замежжа. Чарнобыльская бяда, што напаткала беларускі народ, болем і трывогай адазвалася і ў сэрцах людзей добрай волі, якія гатовы аказваць яму бескарыслівую дапамогу.

Асабліва частымі гасцямі ў нашым горадзе сталі нямецкія сябры. Даўно мае з імі цесныя кантакты і наш універсітэт. Гэта ў першую чаргу звязана з тым, што тут адкрылася спецыяльнасць па вывучэнню нямецкай мовы.

Студэнты, якія ёй авалодваюць, а таксама выкладчыкі неаднаразова мелі магчымасць пабываць на зямлі Германіі ў якасці перакладчыкаў з групамі дзяцей, што вывозіліся туды на аздараўленне. Кантакты, якія імі там наладжваліся, далі магчымасць, дзякуючы нямецкаму боку, папаўняць матэрыяльную базу вучэбнага працэсу ў ГДУ.

Нядаўна гасцямі універсітэта стала вялікая група нямецкіх сяброў з г. Дзіпхольц (Ніжняя Саксонія). Яе кіраўнік пан Вашке ў Гомелі ўжо не ўпершыню. Дэлегацыя, у якую ўвайшлі таксама кіраўнік дабрачыннай арганізацыі Германіі па сацыяльнай абароне дзяцей пан Рэзінг, удзельнікі хору царкоўнай абшчыны, вучнёўская моладзь, прывезла з сабой ва універсітэт каштоўны груз — падручнікі граматыкі нямецкай мовы, якіх хопіць кожнаму студэнту ГДУ, тэхнічныя сродкі навучання і інш. Усё гэта было набыта за грошы, сабраныя за канцэрты хору г.Дзіпхольц у час калядных святаў, за іншыя ахвяраванні.

Шчырую падзяку за аказаную дапамогу нямецкім сябрам выказалі першы прарэктар прафесар М.В.Селькін, які адзначыў, што ў ГДУ заўсёды ўдзячны тым людзям, якія ідуць да нас з адкрытым сэрцам, а таксама загадчык кафедры нямецкай мовы дацэнт В.В.Рабенка, выкладчыкі універсітэта. Гасцям была прадстаўлена магчымасць падрабязна пазнаёміцца з ГДУ, яго факультэтамі, лабараторыямі, правесці заняткі са студэнтамі па нямецкай мове, паглядзець цікавую культурную праграму.

Добрым гідам для іх стала Катрын Вештэдт, выпускніца універсітэта г.Гановера, якая з пачатку другога семестра бягучага навучальнага года вядзе са студэнтамі II-III курсаў заняткі -- практыку нямецкай мовы і краіназнаўства. Яна прыехала ў ГДУ, дзякуючы нямецкай службе акадэмічных абменаў і будзе працаваць тут да канца навучальнага года. Для лепшага засваення студэнтамі замежнай мовы яна выкарыстоўвае на занятках прывезеныя з сабой нагляднаыя дапаможнікі -- відэафільмы па класічных нямецкіх творах, у прыватнасці, Т.Мана. Яна ж знаёміць нашых выкладчыкаў з методыкай работы выкладання мовы, якая існуе ў Гановерскім універсітэце.

Абодва бакі, як высветлілася ў час размовы, зацікаўлены ў далейшым умацаванні дзелавых і сяброўскіх кантактаў. Госці асабліва адзначалі, што пашырэнне вывучэння нямецкай мовы беларускімі студэнтамі з"яўляецца важкім укладам ва ўзаемаразуменне паміж народамі, што на сённяшні дзень вельмі важна.

Днямі з партыяй гуманітарнага грузу, які дастаўлены ў г.Гомель з Германіі, ад евангельска-лютэранскай царквы г.Нойштадт для студэнтаў ГДУ спецыяльнасці "Геаграфія і нямецкая мова" перададзены пішучыя машынкі. Гэта не першая дапамога: раней адтуль была атрымана вучэбная літаратура па нямецкай мове.

**Т.ДУБЯК.**

# КРОК ДА ЎМАЦАВАННЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Наш універсітэт наведаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Эліяху Валк, які меў гутарку з кіраўніцтвам ГДУ, выступіў перад членамі Савета, выкладчыкамі і студэнтамі з лекцыяй "Дзяржава Ізраіль 48 гадоў пасля". З ім была таксама прадстаўнік Ізраільскага інфармацыйна-культурнага цэнтра Іна Герасімава.

Мэта візіту пасла -- пашырыць і ўмацаваць сувязі паміж нашымі дзяржавамі, надаць ім новы, больш канструктыўны характар. Як адзначыў Э.Валк, усе мы з"яўляемся сведкамі вялікіх перамен, якія прывялі да таго, што цяпер мы можам свабодна гаварыць аб тым, аб чым раней забаранялася. Кантакты, якія апошнім часам актывізуюцца паміж беларускім і ізраільскім народам, змогуць канчаткова растапіць лёд ранейшага неразумення.

Пасол расказаў аб сваёй краіне, якая была заснавана 48 гадоў назад, яе поспехах ва ўсіх сферах жыцця (нагадаем, што дзяржава Ізраіль, насельніцтва якой на сённяшні дзень складае 4,6 млн. чалавек, па ўзроўню жыцця займае ў свеце высокае 19 месца). Эліяху Валк выказаў упэўненасць, што Беларусь, з яе выдатным, працалюбівым народам, таксама зможа дасягнуць якасна лепшага жыцця, захавае свой суверэнітэт, родную мову.

Пасол адказаў на зададзеныя яму пытанні.

**Т.НІКАЛАЕВА.**



**У Міжнародны дзень тэатра -- 27-га сакавіка -- Н.А.Карнеева выступіла перад студэнтамі геолага-геаграфічнага факультэта.**

**Фота У.Чысціка.**



**Частым госцем студэнтаў нашага універсітэта бывае народная артыстка Беларусі, артыстка абласнога драматычнага тэатра Н.А.Карнеева. Ёсць аб чым расказаць моладзі выдатнай актрысе і чалавеку, якая аддала служэнню тэатральнай музе многія гады свайго жыцця, свой шматгранны талент.**



*Анкета*

# АБ ПРАБЛЕМАХ СТУДЭНЦКАЙ ВУЧОБЫ

Студэнты, якія вывучаюць сацыялагічныя навукі, просяць вас адказаць на пытанні па праблемах вашай вучобы ва універсітэце, аб планах на будучыню. Уважліва прачытайце пытанні і дайце магчымыя варыянты адказаў на іх. Абвядзіце кружочкам нумар таго варыянта адказу, які вам падыходзіць. У свабодным радку можаце дапісаць свае меркаванні.

Сваё прозвішча можна не ўказваць.

***I. Што паўплывала на ваша рашэнне паступіць у ГДУ?***

(Можна ўказваць не больш двух варыянтаў).

1 -- парада бацькоў.

2 -- рэкамендацыя знаёмых, сяброў.

3 -- прэстыжнасць будучай прафесіі.

4 -- магчымасць рэалізаваць свае здольнасці.

5 -- магчымасць атрымаць якую-небудзь адукацыю.

6 -- набытыя раней веды ў гэтай сферы.

7 -- цяжка адказаць.

8 -- іншае (укажыце -- што)

---

***II. Ці задавальняе вас якасць атрыманых ведаў?***

1 -- задавальняе.

2 -- не заўсёды задавальняе.

3 -- не задавальняе.

4 -- мне ўсё роўна.

5 -- цяжка адказаць.

6 -- іншае (укажыце-- што) ----

---

***III. Якія з пералічаных ніжэй фактараў аказваюць найбольшы ўплыў на эфектыўнасць навучання?***

(Можна ўказаць не больш трох варыянтаў).

1 -- узровень выкладання.

2 -- адносіны студэнтаў да вучобы.

3 -- матэрыяльная зацікаўленасць студэнтаў.

4 -- захаванне дысцыпліны.

5 -- узаемаадносіны ў групе.

6 -- матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу.

7 -- цяжка адказаць.

8 -- іншае (укажыце -- якія) --

---

***IV. Ацаніце, калі ласка, узровень выкладання на факультэце.***

1 -- большасць выкладчыкаў добра тлумачыць прадмет.

2 -- невялікая частка выкладчыкаў добра тлумачыць прадмет.

3 -- узровень выкладання не адказвае сучасным патрабаванням.

4 -- не ўсе выкладчыкі зацікаўлены ў поспехах студэнтаў.

5 -- цяжка адказаць.

6 -- іншае (укажыце канкрэтна) ----

---

***V. Ці жадалі б вы атрымаць магчымасць выбару вывучаемых дысцыплін?***

1 -- так.

2 -- не.

3 -- па асобных прадметах.

4 -- цяжка адказаць.

5 -- іншае (укажыце-- што) ----

---

***VI. Ацаніце, калі ласка, узровень камп"ютэрызацыі вучэбнага працэсу.***

1 -- упаўне адпавядае сучасным патрабаванням.

2 -- камп"ютэрызацыя ўскладняецца недахопам ЭВМ.

3 -- няма неабходнасці ў камп"ютэрызацыі.

4 -- цяжка адказаць.

5 -- іншае (укажыце -- што) ---

---

***VII. Як вы думаеце, ці спатрэбяцца атрыманыя вамі веды ў будучай вашай практычнай дзейнасці?***

1 -- значная частка ведаў спатрэбіцца.

2 -- спатрэбіцца толькі невялікая іх частка.

3 -- не спатрэбяцца.

4 -- цяжка адказаць.

5 -- іншае (укажыце -- што) ---

---

***VIII. Калі вы лічыце, што не спатрэбяцца, то чаму?***

1 -- тэарэтычныя веды не фарміруюць прафесійных навыкаў.

2 -- арганізацыя вытворчай практыкі, як правіла, носіць фармальны характар.

3 -- выкладанне многіх дысцыплін не ўлічвае сучасных патрабаванняў (укажыце -- якіх)

---

4 -- прафесійная падрыхтоўка атаясамліваецца з аб"ёмам ведаў.

5 -- іншае (укажыце -- што) ---

---

***IX. Ці збіраецеся вы працягваць адукацыю пасля заканчэння ГДУ?***

1 -- так, у форме самаадукацыі.

2 -- жадаў(ла) б скончыць яшчэ адну ВНУ.

3 -- жадаў(ла) б паступіць у аспірантуру.

4 -- паскораныя курсы павышэння кваліфікацыі.

5 -- не, не збіраюся.

6 -- цяжка адказаць.

7 -- іншае (укажыце -- што) ---

---

***X. Якія, на вашу думку, вынікі ўвядзення аплаты за навучанне?***

(Можна ўказаць некалькі варыянтаў адказаў).

1 -- павысіўся ўзровень выкладання.

2 -- частка здольнай моладзі страціла магчымасць вучыцца.

3 -- палепшылася матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ГДУ.

4 -- сітуацыя не змянілася.

5 -- адносіны студэнтаў да вучобы сталі больш адказнымі.

6 -- якасць ведаў знізілася.

7 -- цяжка адказаць.

8 -- іншае (укажыце -- што) ---

---

***XI. Ці ўпэўнены вы ў тым, што будзеце працаваць па спецыяльнасці?***

1 -- так.

2 -- не.

3 -- цяжка адказаць.

4 -- іншае (укажыце -- што) ---

---

***XII. Калі вы не ўпэўнены ў гэтым, то чаму?***

(Можна ўказаць некалькі варыянтаў адказаў)

1 -- мала патрабуецца спецыялістаў дадзенага профілю.

2 -- эканамічная сітуацыя ў краіне нестабільная.

3 -- выгадней займацца камерцыйнай дзейнасцю.

4 -- узровень ведаў не адпавядае сучасным патрабаванням.

5 -- мой выбар спецыяльнасці аказаўся памылковым.

(Заканчэнне на 4 стар.)

## Анкета АБ ПРАБЛЕМАХ СТУДЭНЦКАЙ ВУЧОБЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 4 стар.)

6 -- іншае (укажыце -- што) ---
---------------------------------------------
---------------------------------------------

***XIII. Ці жадалі б вы працаваць па выбранай вамі спецыяльнасці?***

1 -- так.
2 -- не.
3 -- цяжка адказаць.
4 -- іншае (укажыце -- што) ---
---------------------------------------------
---------------------------------------------

***XIV. На чыю дапамогу вы разлічваеце пры працаўладкаванні?***

1 -- родных.
2 -- паслугі службы занятасці.
3 -- толькі на сябе.
4 -- знаёмых, сяброў.
5 -- ёсць дагавор з прадпрыемствам (калектывам).
6 -- вышэйшай навучальнай установы.
7 -- гэта праблема пакуль мяне не хвалюе.
8 -- цяжка адказаць.
9 -- іншае (укажыце -- што) ---
---------------------------------------------
---------------------------------------------

І ў заключэнне паведаміце некаторыя звесткі аб сабе:

***XV. Ваш пол:*** 1 -- мужчынскі, 2 -- жаночы.

***XVI.Курс:*** 1 -- першы, 2 -- другі, 3 -- трэці, 4 -- чацверты, 5 -- пяты.

***XVII. Факультэт, спецыяльнасць*** ---------------------------------------------
---------------------------------------------

***XVIII. Род заняткаў непасрэдна перад паступленнем у ГДУ:***

1 -- вучоба ў школе.
2 -- вучоба ў тэхнікуме, вучылішчы.
3 -- праца на вытворчасці.
4 -- служба ў арміі.
5 -- іншае (укажыце -- што) ---
---------------------------------------------
---------------------------------------------

***XIX. Месца жыхарства да паступлення ў ГДУ:***

1 -- абласны цэнтр.
2 -- іншы буйны горад вобласці (горад абласнога падпарадкавання).
3 -- раённы цэнтр вобласці.
4 -- гарадскі, рабочы пасёлак вобласці, які не з"яўляецца райцэнтрам.
5 -- іншая вобласць рэспублікі (якая?) ---------------------------------
6 -- іншая рэспубліка (якая?) -
---------------------------------------------

***XX. Ці ёсць у вас родныя па выбранай спецыяльнасці?***

1 -- так. 2 -- не.

***XXI. Сямейнае становішча:***

1 -- не замужам (не жанаты).
2 -- замужам (жанаты).

Дзякуем вам за ўдзел у апытанні!

**Запоўненую анкету здаваць у рэдакцыю газеты (к.№4, п.1-18)**

# ЗАПРАШАЕ МУЗЕЙ

Унікальная выстаўка мастацка-графічных прац "Ваяры Беларусі VII-VIII ст.ст." адкрываецца ў Археалагічным музеі кафедры ўсеагульнай гісторыі. Арганізавана яна пры садзейнічанні дэканата гісторыка-юрыдычнага факультэта. 16 карцін-рэканструкцый узбраення і баявой экіпіроўкі славян, літоўцаў, ятвягаў і скандынаваў выканаў малады гомельскі мастак Юрый Лупіненка. Арганізацыя выстаўкі -- новы крок ва ўзнаўленні Археалагічнага музея, які рыхтуецца да адкрыцця сваёй асноўнай экспазіцыі.

Для аўтара выстаўкі праца над карцінамі -- не толькі даўняе захапленне, але і глыбокі гістарычны пошук. Кола інтарэсаў Ю.Лупіненкі -- старажытная і сярэдневяковая гісторыя Беларусі і, у першую чаргу, яе "белыя плямы". А да іх адносіцца і праблема навукова абгрунтаванай, кваліфікаванай рэканструкцыі воінскіх убораў, камплектаў наступальнага і абарончага ўзбраення нашых продкаў. Тут для даследчыка і мастака адкрываецца шырокая прастора дзейнасці. З аднаго боку, вучоныя знаходзяць у нашай зямлі нямала сведчанняў воінскай гісторыі, з другога -- рэканструкцый старажытнага і сярэдневяковага ўзбраення вельмі мала, ды і не ўсе яны навукова абгрунтаваныя.

Ю.Лупіненка супрацоўнічае з універсітэтам ужо не першы год. Яго праца "Гомельскі замак у XVI стагоддзі" упрыгожвае Археалагічны музей. Унікальныя знаходкі прадметаў сярэдневяковага ўзбраення, зробленыя ў Гомелі рукамі нашых студэнтаў у ходзе раскопак на тэрыторыі парка імя Луначарскага, пакладзены ў аснову графічнага ўзнаўлення комплексу ўзбраення і экіпіроўкі гомельскага ратніка XII-XIII стагоддзяў.

Наведванне выстаўкі будзе карысным не толькі для спецыялістаў і студэнтаў-гісторыкаў, але і для ўсіх, хто цікавіцца мінулым Беларусі. Плануецца правядзенне калектыўных экскурсій. Заяўкі на іх арганізацыю прымаюцца ў кабінеце ўсеагульнай гісторыі па тэл. 56-74-90. Выстаўка экспануецца ў корпусе № 2, аўд. 2-13.

**А.МАКУШНІКАЎ,**
**кандыдат гістарычных навук, заг. Археалагічнага музея кафедры ўсеагульнай гісторыі.**

## НА ВЫСТАЎКУ-СЕМІНАР

Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, БДУ, Міжнародная асацыяцыя кансультантаў па адукацыі і кірмашах (Германія, Бон), Інавацыйны адукацыйны цэнтр (Масква) запрашаюць вас прыняць удзел у штогадовай Міжнароднай выстаўцы-семінары "Беларусь. Адукацыя-96". Яна пройдзе 25-27 красавіка 1996 года на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта ( г. Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, адкрыццё 25 красавіка ў 10.00).

**За інфармацыяй звяртацца ў корпус №5, аўд. 5-14, НДІ ГДУ, тэл. 56-73-38.**



# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ аб'яўляе прыём студэнтаў на I курс дзённага аддзялення на 1996-1997 навучальны год

Ва універсітэт прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю і пастаянна пражываюць у рэспубліцы, а таксама грамадзяне Беларусі і беларусы, якія пражываюць за яе межамі (для атрымання другой вышэйшай адукацыі прымаюцца асобы на ўмовах поўнай аплаты навучання).

Універсітэт ажыццяўляе прыём студэнтаў звыш плана прыёму на ўмовах дагавораў з аплатай юрыдычнымі або фізічнымі асобамі. Заключэнне дагавораў ажыццяўляецца пасля правядзення конкурсу.

Усе пытанні, звязаныя з прыёмам ва універсітэт, вырашаюцца прыёмнай камісіяй на падставе "Парадку прыёму ў дзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь на 1996 год".

Прыём заяў з **26 чэрвеня па 15 ліпеня**. Уступныя экзамены з **16 ліпеня**, залічэнне ў састаў студэнтаў: па плану -- да **5 жніўня, на ўмовах аплаты -- да 25 жніўня.**

Паступаючыя на ўсе спецыяльнасці здаюць 3 конкурсныя экзамены (паступаючыя на спецыяльнасці "Правазнаўства", "Геаграфія", "Геаграфія і англійская мова", "Геаграфія і нямецкая мова" і "Фізічная культура і спорт" дадаткова здаюць па аднаму пазаконкурснаму экзамену).

| № | Спецыяльнасць | Экзамены | № | Спецыяльнасць | Экзамены |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Руская мова і літаратура | 1. Руская мова і літаратура (сачыненне). 2.Руская мова і літаратура (вусна). 3.Беларуская мова і літаратура (вусна). | 14. | Геалогія і разведка карысных выкапняў | --//-- |
| 2. | Руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура | 1. Руская або беларуская мова і літаратура (сачыненне). 2. Беларуская мова і літаратура (вусна). 3. Руская мова і літаратура (вусна). | 15. | Гісторыя | 1. Гісторыя Беларусі (вусна). 2. Замежная мова (вусна). 3. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна). |
| 3. | Беларуская мова і літаратура | 1. Беларуская мова і літаратура (сачыненне). 2. Беларуская мова і літаратура (вусна). 3. Руская мова і літаратура (вусна). | 16. | Гісторыя і англійская мова | 1. Гісторыя Беларусі (вусна). 2. Англійская мова (вусна). 3. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна). |
| 4. | Беларуская мова і літаратура і англійская мова | 1. Беларуская мова і літаратура (сачыненне). 2. Англійская мова (вусна). 3. Беларуская мова і літаратура (вусна). | 17. | Гісторыя і нямецкая мова | 1. Гісторыя Беларусі (вусна). 2. Нямецкая мова (вусна). 3. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна). |
| 5. | Англійская мова | 1. Англійская мова (вусна). 2. Гісторыя Беларусі (вусна). 3. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна). | 18. | Правазнаўства | 1. Гісторыя Беларусі (вусна). 2. Матэматыка (вусна). 3. Замежная мова (вусна). 4. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна, пазаконкурсны экзамен). |
| 6. | Нямецкая мова | 1. Нямецкая мова (вусна). 2. Гісторыя Беларусі (вусна). 3. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна). | 19. | Геаграфія | 1. Геаграфія (вусна). 2. Замежная мова (вусна). 3. Фізіка (вусна). 4. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна, пазаконкурсны экзамен). |
| 7. | Матэматыка | 1. Матэматыка (вусна). 2. Матэматыка (пісьмова). 3. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна). | 20. | Геаграфія і англійская мова | 1. Геаграфія (вусна). 2. Англійская мова (вусна). 3. Фізіка (вусна). 4. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна, пазаконкурсны экзамен). |
| 8. | Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт | --//-- | 21. | Геаграфія і нямецкая мова | 1. Геаграфія (вусна). 2. Нямецкая мова (вусна). 3. Фізіка (вусна). 4. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна, пазаконкурны экзамен). |
| 9. | Эканамічная інфарматыка | --//-- | 22. | Біялогія і хімія | 1. Біялогія (вусна). 2. Хімія (вусна). 3. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна). |
| 10. | Эканоміка і кіраванне вытворчасцю | --//-- | 23. | Фізічная культура і спорт (аддзяленні спартыўнага ўдасканалення) | 1. Экзамен па спецфізпадрыхтоўцы. 2. Біялогія (вусна). 3. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна). 4. Плаванне (пазаконкурсны экзамен). |
| 11. | Прыкладная матэматыка | --//-- | | | |
| 12. | Фізіка (вытворчае і педагагічнае аддзяленні) | 1. Фізіка (вусна). 2.Матэматыка (вусна). 3. Руская або беларуская мова і літаратура (вусна). | | | |
| 13. | Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі | --//-- | | | |

(Заканчэнне на 6 стар.)

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ аб' яўляе прыём студэнтаў на I курс дзённага аддзялення на 1996-1997 навучальны год

(Заканчэнне. Пачатак на 5 стар.)

Абітурыенты, якія не з"явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да далейшых экзаменаў не дапускаюцца. Уступныя экзамены (за выключэннем экзаменаў па спецфізпадрыхтоўцы і плаванню для спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт") праводзяцца па праграмах, складзеных у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджаных Міністэрствам адукацыі і навукі.

Абітурыенты, паступаючыя на ўсе спецыяльнасці, акрамя першых чатырох, указаных у табліцы, здаюць па выбару экзамен па беларускай мове і літаратуры або рускай мове і літаратуры (вусна). Паступаючыя на спецыяльнасць "Руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура" пішуць па выбару сачыненне па беларускай мове і літаратуры або рускай мове і літаратуры.

Без экзаменаў залічваюцца пераможцы (I, II, III месцы) міжнародных, а таксама рэспубліканскіх алімпіяд выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў і педвучылішчаў, праведзеных Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь у 1995/96 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці. Гэтыя асобы пры паступленні на іншыя спецыяльнасці, а таксама пераможцы (I, II, III месцы) абласных і Мінскага гарадскога тураў алімпіяд выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў 1995/96 навучальнага года, якія праводзяцца органамі кіравання адукацыяй па агульнаадукацыйных прадметах, пры паступленні на любыя спецыяльнасці вызваляюцца ад аднаго з уступных экзаменаў па гэтай дысцыпліне з выстаўленнем адзнакі "пяць".

Асобы, якія скончылі сярэднюю навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную установу або ПТВ з дыпломам з адзнакай, здаюць усе ўступныя экзамены.

Універсітэт праводзіць здачу сумешчаных экзаменаў для асоб, якія паспяхова вучацца на факультэце давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі па прадстаўленню дэканата гэтага факультэта. Сумешчаная здача экзаменаў праводзіцца з 18 па 26 мая. Асобы, якія паспяхова здалі сумешчаныя экзамены, маюць права ўдзельнічаць з атрыманымі адзнакамі ў конкурсе разам з абітурыентамі, якія здаюць уступныя экзамены ў летні час. Асобы, якія жадаюць палепшыць адзнакі, атрыманыя на сумешчаных экзаменах, здаюць у перыяд з 16 ліпеня ўсе ўступныя экзамены і паступаюць ва універсітэт на агульных падставах.

Выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення залічваюцца ў адпаведнасці з палажэннем аб ім.

Універсітэт аб"яўляе мэтавы прыём на педагагічныя спецыяльнасці. Колькасць выдзеленых мэтавых месц вызначаецца прыёмнай камісіяй да пачатку ўступных экзаменаў на падставе плана мэтавага прыёму, зацверджанага Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь.

Залічэнне ва універсітэт праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на ўступных конкурсных экзаменах. Конкурс праводзіцца па спецыяльнасцях і аддзяленнях спецыяльнасці (для спецыяльнасцей "Фізіка" і "Фізічная культура і спорт").

Па дзвюх групах спецыяльнасцей: "Гісторыя", "Гісторыя і англійская мова", "Гісторыя і нямецкая мова", а таксама "Геаграфія", "Геаграфія і англійская мова", "Геаграфія і нямецкая мова" праводзіцца адзіны конкурс.

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца:

-- воіны-інтэрнацыяналісты;

-- інваліды I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі;

-- асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт.18 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС";

-- круглыя сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў;

-- дзеці з сем"яў загінуўшых (памёршых) або стаўшых інвалідамі ў час праходжання воінскай службы або работы ў складзе войск на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем"яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памёршых) у мірны час пры праходжанні воінскай службы.

Пры роўнасці конкурсных балаў перавагу маюць:

-- медалісты школ, выдатнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ПТВ на аснове базавай школы, а таксама выдатнікі ПТВ на аснове сярэдняй школы пры паступленні на спецыяльнасці, адпавядаючыя атрыманым прафесіям;

-- інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў;

-- асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 19, 20, 23, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС";

-- прафесійна арыентаваныя абітурыенты (скончылі факультэт давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі, маюць стаж работы па спецыяльнасцях, адпавядаючых выбранай, або іншую прафесійную арыентацыю);

-- абітурыенты, у якіх бацька або маці інваліды, або абітурыенты са шматдзетных сем"яў.

На месцы звыш плана прыёму, колькасць якіх вызначаецца прыёмнай камісіяй, у першую чаргу залічваюцца абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу. На тыя месцы, якія засталіся, залічваюцца абітурыенты па выніках субяседавання па прадметах уступных экзаменаў.

Паступаючыя ва універсітэт падаюць наступныя дакументы:

-- заяву на імя рэктара;

-- дакумент аб сярэдняй адукацыі;

-- 6 фотакартак памерам 3х4;

-- медыцынскую даведку па форме 086/У (паступаючыя на спецыяльнасць "Фізічная культура і спорт" дадаткова праходзяць медыцынскі агляд у Гомельскім абласным фізкультурным дыспансеры);

-- дакументы, якія пацвярджаюць права карыстання льготамі;

-- пашпарт (прад"яўляецца ў прыёмную камісію па прыбыцці ва універсітэт).

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул. Савецкая, 102, Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны, корп. №5, прыёмная камісія. Тэл. для даведак: 57-54-62.

**ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ.**

## ЦІКАВЫ РАСКАЗ І КНІГІ НА ЎСПАМІНЫ

На днях наш факультэт наведаў яго выпускнік, цяпер кандыдат філалагічных навук, кіраўнік навукова-метадычнага цэнтра гульні і цацкі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь А.Ю.Лозка. Алесь Юр"евіч расказаў пра дзейнасць свайго навуковага калектыву, пазнаёміў студэнтаў са сваімі кнігамі, адказаў на зададзеныя пытанні. Напрыканцы сустрэчы жадаючыя змаглі набыць кніжныя навінкі, на якіх аўтар пакінуў кожнаму на ўспаміны свой аўтограф.

**А.МАКАГОН, студэнтка гр. Б-ІІ філалагічнага факультэта.**



У суверэннай Рэспубліцы Беларусь на першую нядзелю красавіка ўстаноўлены Дзень геолага. Сёлета ён адзначаўся ўпершыню. З нагоды гэтай падзеі мы звярнуліся да дэкана геолага-геаграфічнага факультэта, загадчыка кафедры геафізікі прафесара А.П.Пінчука і папрасілі яго адказаць на некалькі пытанняў.

## РЫХТУЕМ ДАСТОЙНУЮ ЗМЕНУ

*-- Адам Пятровіч, з якімі здабыткамі ваш калектыў падышоў да святочнай даты?*

-- Пра гэта можна гаварыць шмат. Тым больш, што нельга адыходзіць ад гісторыі. Як вядома, Дзень геолага існаваў і пры былым СССР. Дык вось, вучоныя і выкладчыкі нашага факультэта аддалі геалагічнай службе многа сіл і энергіі. Яны вывучалі нетры розных рэгіёнаў цяперашняга СНД, плённа працавалі ў палявых экспедыцыях, партыях, атрадах. Імі складзены дзесяткі аркушаў геалагічных, гідрагеалагічных і геафізічных карт, разведаны і адкрыты месцы нараджэння алмазаў, золата, серы, вугалю, нафты, гіпсу, будаўнічых матэрыялаў, прэснай і мінеральнай лекавай вады. А зараз яны перадаюць свае грунтоўныя веды і багаты вопыт будучым геолагам, якія прыйдуць на змену старэйшаму пакаленню. З павагай называю нашых ветэранаў -- прафесараў В.А.Вахрушава і Г.А.Кузняцова, дацэнтаў М.А.Жураўля, У.Э.Каўдэрку, А.А.Недавізіна, І.С.Лазарава, Л.Д.Мядзведзева, вучоных малодшага пакалення Ю.П.Іванова, В.Г.Жоглу, Г.А.Сербіна, М.Р.Вяруціна, А.М.Гумена, А.Ф.Акулевіча.

У цяперашні час на нашым факультэце навучаецца 369 студэнтаў. З іх -- 41 па спецыяльнасці інжынера-геолага, 49 -- геолага-гідрагеолага, 45 -- геолага-геафізіка і 234 -- географа.

Не так даўно на факультэце з"явілася новая спецыяльнасць "Геалогія і разведка карысных выкапняў" з шырокім спектрам спецыялізацый: геафізічныя метады пошуку і разведкі, геаэкалогія, гідрагеалогія і інжынерная геалогія і інш. Адкрыццё шырокага спектра спецыялізацый дазваляе хутка рэагаваць на падрыхтоўку спецыялістаў для розных галін гаспадаркі. Так, спецыялісты нашага факультэта ў залежнасці ад атрыманай спецыялізацыі могуць працаваць эколагамі ў саўгасах і калгасах, на прамысловых прадпрыемствах, вывучаць геалогію і праводзіць разведку карысных выкапняў.

Значныя дасягненні ёсць і ў навукова-даследчай рабоце. Гэта асабліва датычыцца вывучэння геадынамічнай актыўнасці нетраў Гомельшчыны, экалагічнага стану падземных вод, выкарыстання гідратэрмальных рэсурсаў Прыпяцкага прагібу. Па ўказаных напрамках апублікаваны шэраг навуковых артыкулаў у выданнях Беларусі, СНД і за іх межамі.

*-- Колькі падрыхтавана спецыялістаў па геалогіі за гады існавання вашага факультэта, дзе яны цяпер працуюць?*

-- Наш факультэт існуе з 1969 года. За прайшоўшы час на ім падрыхтавана звыш 1550 спецыялістаў. Яны працуюць ва ўсіх кутках былога СССР. Цяпер, відавочна, немагчыма знайсці такога рэгіёна СНД, дзе б не было нашых выпускнікоў. Вось толькі невялікі пералік гарадоў, дзе яны працуюць: Мінск, Гомель, Брэст, Гродна, Магілёў, Віцебск, Мурманск, Калінінград, Адэса, Сімферопаль, Алушта, Бранск, Горкі, Цюмень, Іркуцк, Паўднёва-Сахалінск, Якуцк, Магадан, Ташкент, Анадыр, Уладзівасток і інш.

*-- Назавіце некалькі прозвішчаў самых вядомых выпускнікоў вашага факультэта.*

-- Першым назаву члена-карэспандэнта Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь А.А.Махнача. Ганарымся мы і В.І.Пашкевічам, кандыдатам геолага-мінералагічных навук, які працуе вучоным сакратаром Інстытута геалогіі Акадэміі навук нашай краіны. Сярод нашых выпускнікоў ёсць начальнікі трэстаў, экспедыцый, партый, ПМК і г.д. Іх шмат, усіх не пералічыш. Непасрэдна ў Гомелі працуюць нашыя выпускнікі -- кандыдаты геолага-мінералагічных навук загадчык лабараторыі нафтапрамысловай геалогіі М.К.Карташ -- старшыня партыі "Зялёных", начальнік аддзела БелНДПІнафта М.А. Вярэмка і інш. Некаторыя выпускнікі факультэта засталіся працаваць ва універсітэце, сталі вучонымі.

*-- Напярэдадні вашага прафесійнага свята адбылося размеркаванне спецыялістаў сёлетняга выпуску. Куды накіраваны вашы выхаванцы?*

-- Выпускнікі геолага-геафізічнага напрамку размеркаваны ў геалагічныя арганізацыі нашага горада. Два чалавекі паедуць у Якуцію.

*-- Пажадаем ім поспехаў у працы.*

**Гутарку вёў У.БАЛОГА.**

## ЛАЎРЭАТЫ КОНКУРСУ

Аргкамітэт падвёў вынікі конкурсу 1995 года на лепшую навуковую работу студэнтаў ВНУ Беларусі па гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навуках. Дыпломаў Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь I ступені з прысваеннем звання "Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў" удастоены пяцікурснікі нашага універсітэта Уладзімір Меляneўскі з геолага-геаграфічнага факультэта за работу "Электраметрыя -- экспрэс-метад геаэкалагічнага карціравання зон тэхнагеннага забруджвання" і Алена Сянкевіч з завочнага факультэта за работу "Цэны, даходы і ўзровень жыцця насельніцтва". Іх навуковыя кіраўнікі -- адпаведна асістэнт кафедры геафізікі А.П.Гусеў і загадчык кафедры эканомікі і сацыялогіі працы дацэнт І.П. Трацэўскі. Яны таксама адзначаны Дыпломамі Міністэрства адукацыі і навукі. Акрамя таго для пераможцаў конкурсу і іх навуковых кіраўнікоў прадугледжаны грашовыя прэміі.

Аргкамітэт адзначыў, што на добрым узроўні быў арганізаваны і праведзены рэспубліканскі конкурс камісіяй па раздзелу "Геаграфічныя навукі", якую ўзначальваў намеснік дэкана геолага-геаграфічнага факультэта ГДУ Ю.П.Іваноў, а яе сакратаром быў загадчык кафедры геаграфіі І.І.Богдэль. Ім аб'яўлена падзяка.

(Наш кар.).

ІНФАРМУЕ ПРАФКОМ

# ЛЕТАСЬ СКАРЫСТАЛІ ПУЦЁЎКІ

**(Заканчэнне. Пачатак у №5)**

**Дзіцячыя аздараўленчыя лагеры:**

дзеці супрацоўнікаў: Андрэевай В.А. -- (бібліятэкар ГДУ).

Васільевай Н.В. -- (лабарантка кафедры фізічнай метралогіі).

Пашук С.Я. -- (начальнік планава-фінансавага аддзела).

Феакціставай А.Г. -- (камендант інтэрната N 2).

Вішанковай А.А. -- (інжынер ІВЦ).

Гарскова І.І. -- (выкладчык кафедры радыёфізікі).

**Дамы адпачынку і пансіянаты:**

Шэнец Е.Г. з дзіцем -- швейцар інтэрната N 1.

Сізікава Л.Н. з двума дзецьмі -- дзяжурная інтэрната N 2.

Цітова Н.Н. з дзіцем -- інжынер НДС.

Скачкова В.А. -- малодшы навуковы супрацоўнік НДС.

Старавойтава Н.А. з дзіцем -- выкладчыца кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.

Старавойтаў А.П. -- дацэнт матэматычнага факультэта.

Курдзесава Л.В. -- апаратар ІВЦ.

Шараметава С.П. з дзіцем -- эканаміст планава-фінансавага аддзела.

Трафімовіч І.Р. з дзіцем -- дацэнт кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту.

Сафонаў В.Г. з дзіцем -- аспірант матэматычнага факультэта, ліквідатар аварыі на ЧАЭС.

Каўдэрка У.Э. -- дацэнт геолага-геаграфічнага факультэта, ліквідатар аварыі на ЧАЭС.

Сукач А.І. з дзіцем -- выкладчыца матэматычнага факультэта.

Лісоўскі В.В. з дзіцем -- ст. выкладчык кафедры фізвыхавання.

Фаміна Г.В. з дзіцем -- аспірантка матэматычнага факультэта.

Бялова Л.А. -- выкладчыца кафедры рускай мовы для замежных студэнтаў.

Бондарава Л.С. -- эканаміст планава-фінансавага аддзела.

Панова Т.Л. з дзіцем -- дацэнт кафедры бухуліку.

Іванова Т.І. з дзіцем -- асістэнт кафедры бухуліку.

Семчанка І.В. -- дэкан фізічнага факультэта.

Коўтун І.А. з дзіцем -- выкладчыца кафедры нямецкай мовы.

Палій Н.В. з дзіцем -- машыністка машбюро.

**Турбазы:**

Зауліна Г.В. з дзіцем -- асістэнт кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.

Жлоба О.І. з дзіцем -- інжынер ІВЦ.

Аўдоніна Т.В. -- асістэнт кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.

Капшай М.М. з дзіцем -- інжынер НДС.

Каржоў В.С. з дзіцем -- дацэнт эканамічнага факультэта.

Царыкаў Б.В. -- дацэнт факультэта фізічнай культуры.

Раманенка І.А. з дзіцем -- медсястра санаторыя-прафілакторыя ГДУ.

Кульбакоў М.А. з дзіцем -- нам. дэкана факультэта фізічнай культуры, ліквідатар аварыі на ЧАЭС.

Еўтухоў У.Д. -- дэкан філалагічнага факультэта.

Нікіцяніна Е.І. з дзіцем -- лабарантка кафедры рускай мовы для замежных студэнтаў.

Янкоўская І.С. -- бухгалтар ГДУ.

Еўтухова І.Г. -- выкладчыца філалагічнага факультэта.

Старавойтаў М.І. -- дэкан гісторыка-юрыдычнага факультэта, ліквідатар аварыі на ЧАЭС.

Такарэнка О.А. -- выкладчыца матэматычнага факультэта (з двума дзецьмі).

Бойка А.А. з дзіцем -- інжынер НДС, ліквідатар аварыі на ЧАЭС.

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- усеагульнай гісторыі -- дацэнта, ст. выкладчыка;

-- беларускай мовы -- асістэнта;

-- рускай літаратуры -- ст. выкладчыка (2), асістэнта;

-- англійскай мовы -- выкладчыка (6);

-- французскай мовы -- заг. кафедры, выкладчыка;

-- нямецкай мовы -- выкладчыка;

-- матэматычных праблем кіравання -- ст. выкладчыка;

-- бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці -- ст. выкладчыка;

-- псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі -- дацэнта;

-- хіміі -- ст. выкладчыка, асістэнта;

-- фізіялогіі чалавека і жывёлін -- дацэнта, асістэнта;

-- геафізікі -- ст. выкладчыка;

-- геаграфіі -- ст. выкладчыка;

-- тэорыі і методыкі фізічнай культуры -- заг. кафедры;

-- лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту -- дацэнта;

-- фізвыхавання -- выкладчыка (2);

-- аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

спорт

# ТРЭНІРАВАЛІСЯ НЯДОЎГА

У Мінску прайшлі рэспубліканскія спаборніцтвы па пауэрліфтынгу -- сілавому трохбор"ю (жым лежачы, станавая цяга і прысяданні са штангай) -- у праграме студэнцкіх гульняў.

У вагавай катэгорыі да 90 кг перамог студэнт 2 курса факультэта фізічнай культуры майстар спорту Сяргей Гуцаў. Пяцікурснік фізічнага факультэта кандыдат у майстры спорту Андрэй Садоўскі прывёз з Мінска бронзавы медаль.

У камандным заліку нашы асілкі занялі трэцяе месца, уступіўшы толькі студэнтам Мінска -- політэхнічнай акадэміі і эканамічнага універсітэта.

Важная дэталь: нашу каманду трэніруе ст. выкладчык кафедры фізічнага выхавання Уладзімір Галавач, а трэніруюцца нашы студэнты менш двух гадоў. Пры такіх тэмпах не за гарамі і больш высокія дасягненні.

**В.МАРЧАНКА.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты факультэта фізічнай культуры выказваюць глыбокае спачуванне старшаму выкладчыку кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту **ПАДАСІНАВУ** Васілю Дзмітрыевічу з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **МАЦІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 201
Падпісана да друку 5.04.96.